Людміла Кебіч

## ВЯЛІКДЗЕНЬ

Божа Магутны!
Усё з тваёй ласкі.
Мы дачакаліся
Светлае Пасхі.
Ежы святочнай
з чубам талеркі.
Дзеці на вуліцы
скачуць у “бэрка”:
“Бэрак, Бэрак, дай цукерак,
у цябе поўны куфэрак!
Бэрак, Бэрак, дай каўбаскі,
я не еў да самай Пасхі!”
Светлай нядзелькай
з самага рання
свет захліснула
хваля кахання.
Будзіць матуля –
час разгавецца.
Песня святая
ў неба ліецца:
“Хрыстос уваскрос!
Хрыстос уваскрос!
Хрыстос уваскрос!”
Божа мой ясны,
з тваёй мілосці
заўтра наедуць
родныя ў госці.
Новыя кошычкі,
новыя сачкі –
пойдуць па хатах
маленькія жачкі:
“А дай нам, бабка, усім па яечку.
Да зялён явар, кудравы!
Усім па яечку, ды па чырваненькім.
Да зялён явар, кудравы!”

